# Канферэнцыі. Сімпозіумы

С.У. Дзядзінкіна

## «Журналістыка – 2004» – новы погляд на творчую прафесію

Журналісцкая адукацыя планамерна інтэгруе ў сусветную камунікацыйную прастору. Сучаснасць патрабуе ад журналісцкай прафесіі такой ступені кваліфікацыі, якую немагчыма ўявіць без найноўшых тэхналогій у сферах PUBLIC RELATIONS, тэорыі камунікацыі, інфарматыкі, сацыялогіі, паліталогіі, тэорыі і практыкі друкаванага слова.

Сітуацыя на медыярынку хутка змяняецца, як і сутнасныя і статусныя парадыгмы функцыянавання СМІ. У выніку трансфармуюцца і змест, і падыходы да навучання журналістаў. Таму стаўшыя традыцыйнымі навукова-практычныя канферэнцыі, якія штогод ладзіць факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта пры ўдзеле двух міністэрстваў – інфармацыі і адукацыі, з'яўляюцца своеасаблівым люстэркам стану нацыянальнай інфармацыйнай прасторы, прыносячы плён у справу развіцця мас-медыя. VI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Журналістыка – 2004», якая праходзіла ў Мінску ў снежні 2004 года, была знамянальнай яшчэ і таму, што прымеркавана да 60-годдзя факультэта. Цікава, што факультэт журналістыкі БДУ быў створаны першым у Савецкім Саюзе (у жніўні 1944 г.), раней за кіеўскі (1946 г.) і маскоўскі (1947 г.). Першыя спробы спецыялізаванай журналісцкай падрыхтоўкі ўжо меліся на базе губернскіх партшкол у Віцебску ў 1918 годзе і ў Мінску ў 1920 годзе.

Сёння журфак рыхтуе спецыялістаў па пяці накірунках: «друкаваныя СМІ», «аўдыёвізуальная журналістыка», «міжнародная журналістыка», «інфармацыя і камунікацыя», «літаратурная работа». Мадэрнізацыя навучальнага і навукова-даследчага працэсу на факультэце прывяла да стварэння новых кафедраў: перыядычнага друку, сацыялогіі журналістыкі, тэхналогіі камунікацыі, літаратурна-мастацкай крытыкі, англійскай мовы і моўнай камунікацыі. Па дысцыплінах вучэбнага плана створана новае пакаленне вучэбных праграм – усяго 83!

Па словах дэкана факультэта журналістыкі БДУ, дацэнта В.П. Вараб'ёва, намаганні выкладчыкаў сёння скіраваны на тое, каб ужо за студэнцкай партай маладыя людзі імкнуліся да журналістыкі з моцным інтэлектуальным, кантэкстуальным падыходам. Адначасова факультэту ўдалося ўстанавіць «кансэнсус» паміж тэарэтычным навучаннем і практычнай запатрабаванасцю сучаснага беларускага медыяпрацэсу. Сёння падрыхтоўка да журналісцкай дзейнасці вядзецца ў рэальных рэдакцыйных умовах. Мацнее і навукова-даследчая база беларускай журналістыкі. За апошнія пяць гадоў выкладчыкамі і прафесарамі факультэтата падрыхтавана 68 вучэбных дапаможнікаў, 22 манаграфіі, 9 навуковых зборнікаў, 1118 навуковых артыкулаў і тэзісаў дакладаў, абаронены 24 кандыдацкія і 4 доктарскія дысертацыі. Такім чынам, журфак, сапраўды, фарміруе асноўны творчы патэнцыял інфармацыйнай прасторы Беларусі.

VI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя стала новым крокам да абагульнення міжнароднага і нацыянальнага вопыту журналісцкай тэорыі і практыкі, асэнсавання сацыяльна-культурнага статуса сучаснай журналістыкі і перспектыў яе развіцця.

Першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь *Лілія Ананіч* заўважыла на адкрыцці канферэнцыі, што з прыняццем больш дасканалага

заканадаўства аб СМІ кардынальна зменяцца і адносіны да раённага, рэгіянальнага друку. Ужо ў бліжэйшы час некаторыя раённыя газеты набудуць новае аблічча – пачнуць выходзіць у колеры. Наспела неабходнасць і ва ўнясенні новых паправак і дапаўненняў у Закон аб сродках масавай інфармацыі. Напрыклад, заканадаўства пакуль не рэгулюе стасункі паміж СМІ і Інтэрнэтам, трэба ўдасканальваць і працэс рэгістрацыі СМІ.

Сапраўды, гісторыя сеткавага друку ў нашай краіне налічвае ўсяго 5–6 гадоў. Інтэрнэт-выданні яшчэ не выпрацавалі ні дакладнай класіфікацыі, ні ўстойлівых жанравых форм, ні літаратурных нарматываў. Як зазначыў у сваім навуковым дакладзе дацэнт БДУ *Аляксандр Градзюшка*, выданні ў Інтэрнэце можна падзяліць на две катэгорыі: уласна сеткавыя (дакладны лік якіх вызначыць складана) і онлайнавыя версіі друкаваных СМІ. Па прагнозах, у бліжэйшы час сеткавыя СМІ будуць на роўных канкурыраваць з традыцыйнымі на інфармацыйным полі дзяржавы.

Асобная ўвага на канферэнцыі была нададзена і вывучэнню сучасных тэндэнцый развіцця PUBLIC RELATIONS. Прапанаваны Беларускай асацыяцыяй па сувязях з грамадскасцю і Саветам Інстытута PR праект «Кодэкса прафесійных лаводзін у галіне адносін з грамадскасцю для беларускіх PR-практыкаў» павінен стаць рэгулятарам этычных і маральных норм узаемаадносін спецыялістаў у галіне сувязяў з грамадскасцю.

Зацікаўленая размова адбылася падчас работы секцыі «Літаратурна-мастацкая крытыка», у якой прынялі ўдзел дактары навук *Таццяна Арлова, Людміла Сінькова*, кандыдаты навук *Людміла Саенкова, Пятро Васючэнка, Уладзімір Капцаў, Наталля Кузьміч, Гражына Паўлоўская, Ірына Шаўлякова-Барзенка, Галіна Сачанка* і аўтар гэтых радкоў. Бягучы літаратурны працэс вымушае літаратурных крытыкаў працаваць у фармаце найноўшага універсалізму: з аднаго боку выпрацоўваць такую метамову, якая абуджае масавую зацікаўленасць нацыянальным пісьменствам, з другога – арыентацыя на прафесійнага чытача (сэнсавая і структурная ўскладненасць тэкстаў, эксперыментальнасць форм). Тое ж можна сказаць і пра крытыку іншых відаў мастацтва. Напрыклад, даследчык Л. Саенкова вызначае так званы «кліпавы» падыход у аналізе кінатэкста: галоўная аўтарская ўстаноўка – прадставіць фільм не як мастацкае цэлае, а як прадмет увагі для звычайнай свядомасці. Новая мадыфікацыя жанру рэцэнзіі разглядае твор мастацтва сегментарна ў кантэксце семіятычнага метаду. Такі падыход дазваляе зменшыць дыстанцыю паміж журналісцкім тэкстам і чытачом.

Важнейшае месца ў рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі займае рэгіянальны друк. Сёння ў краіне 135 дзяржаўных выданняў, заснавальнікамі якіх выступаюць абласныя, гарадскія і раённыя выканаўчыя камітэты. Выдаецца 9 абласных, 8 гарадскіх і 118 раённых і аб'яднаных газет. Самая тыражная газета – «Віцьбічы» (Віцебская гарадская). На факультэце было праведзена сацыялагічнае даследаванне, у выніку якога складзены сацыяльна-дэмаграфічны партрэт журналістаў рэгіянальных СМІ. Высветліліся цікавыя факты, якія сведчаць, што назіраецца істотнае размежаванне сярод абласцей па ўдзельнай вазе журналістаў без спецыяльнай адукацыі. У першую групу ўваходзяць Брэсцкая, Мінская і Гродзенская вобласці, дзе рэспандэнты без спецыяльнай журналісцкай адукацыі складаюць меншасць сярод працуючых у СМІ. У другую групу ўваходзяць Гомельская, Магілёўская і Віцебская вобласці, дзе працуюць журналістамі большасць без спецыяльнай адукацыі. Дарэчы, у Віцебскай і Мінскай абласцях больш чым у іншых рэгіёнах працуе журналістаў пенсійнага ўзросту, і мужчын больш, чым жанчын, сярод журналістаў толькі ў Віцебскай вобласці. 55% апытаных журналістаў з Віцебшчыны палічылі нашу прафесію перспектыўнай і прэстыжнай, аднак у іншых абласцях гэта лічба некалькі вышэй.